# Раздзел 3. УКАРАНЕННЕ КУЛЬТУРНЫХ ПРАКТЫК: МАТЭРЫЯЛЫ МАЙСТАР-КЛАСАЎ ПА ЗАХАВАННЮ І РАЗВІЦЦЮ ТРАДЫЦЫЙНАЙ КУЛЬТУРЫ

*Віннікава М. М.,*

кандыдат мастацтвазнаўства,
старшы навуковы супрацоўнік
ДНУ «Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі»

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## АСАБЛІВАСЦІ ТРАДЫЦЫЙНАГА БЕЛАРУСКАГА КАСЦЮМА. ЖАНОЧЫЯ ГАЛАЎНЫЯ ЎБОРЫ РУЧНІКОВАГА ТЫПУ НА БЕЛАРУСІ

Традыцыйны касцюм — адзін з найважнейшых элементаў этнічнай культуры беларусаў. Яго стрыманая эстэтыка добра перадае асаблівасці менталітэту этнасу — сціпласць, добразычлівасць, працавітасць, міфапаэтычнае ўспрыманне свету і тонкае адчуванне прыгажосці.

У пачатку ХХ ст. народнае адзенне беларусаў захоўвала многія архаічныя рысы, якія ў старажытнасці былі ўласцівы адзенню ўсіх славянскіх народаў. Адметнасць беларускага народнага касцюма — у яго рукатворнасці, бо для вырабу выкарыстоўваліся розныя тэхнікі ручнога ўзорыстага ткацтва, вышыўкі, карункавага пляцення.

Народнае адзенне, пашытае ўручную з натуральных матэрыялаў, у асноўным ільняных і шарсцяных саматканак, было камфортным і зручным, гарманічна спалучалася з сялянскім інтэр’ерам і прыродным асяроддзем. Стагоддзямі адпрацаваны крой з прамавугольных полак тканіны быў простым і рацыянальным, у той жа час ён падкрэсліваў зграбнасць фігуры і маскіраваў яе недахопы. Традыцыйны беларускі касцюм не вылучаўся разнастайнасцю кампанентаў, мудрагелістасцю формы, аднак быў шматварыянтным у арнаментальным і вобразна-пластычным вырашэннях.

Асаблівая ўвага надавалася жаночаму касцюму, які быў больш складаным і багатым па аздабленню, чым мужчынскі. Асобныя часткі адзення і іх арнаментальнае ўпрыгажэнне неслі ў сабе старажытную семантыку.

У канцы XIX — пачатку ХХ ст. традыцыйны комплекс жаночага адзення (строй) складаўся з палатнянай сарочкі з доўгімі рукавамі, ільняной, шарсцяной або паўшарсцяной спадніцы, фартуха, пояса, галаўнога ўбору, абутку і шыйных

упрыгажэнняў. Дзяўчаты маглі хадзіць з непакрытай галавой, заплятаючы косы, або насілі невялікія палатняныя павязкі з арнаментаванымі канцамі, якія завязвалі ззаду. Асаблівасцю касцюма замужніх жанчын былі галаўныя ўборы ручніковага тыпу, якія цалкам закрывалі валасы. Яны ўяўлялі сабой доўгія (ад 2,5 да 4,5 м) кавалкі тонкага белага палатна з арнаментальным аздабленнем па краях. У розных месцах Беларусі такі галаўны ўбор меў розныя назвы — «наметка», «намётка», «плат» і інш. Даследчыкі лічаць яго найбольш старажытным агульнаславянскім галаўным уборам. Вядома, што ён існаваў ужо ў XI ст., што адлюстравана на мініяцюрах і фрэсках. Беларускія жанчыны насілі яго яшчэ ў 20-я гг. XX ст., а ў вясельнай і пахавальнай абраднасці ён выкарыстоўваўся да сярэдзіны XX ст. Характэрныя спосабы завівання такога галаўнога ўбору надавалі жаночаму касцюму мясцовую адметнасць.



Мал. 1. Спосаб завівання плата. в. Руховічы Кобрынскага раёна Брэсцкай вобласці. Рэканструкцыя і малюнак М. Віннікавай

Мужчынскі касцюмны комплекс складаўся з палатнянай сарочкі, палатняных ці шарсцяных штаноў, тканага або плеценага шарсцянога пояса. У халодную пару мужчыны і жанчыны насілі суконныя світкі. Сялянскім абуткам былі лыкавыя лапці, скураныя чаравікі, боты.

У каларыце касцюмных комплексаў пераважала спалучэнне серабрыста-белага колеру льнянога адзення і чырвонага колеру арнаментальнага ўпрыгажэння — паласатага, ромба-геаметрычнага або стылізаванага расліннага. Арнамент меў не толькі дэкаратыўнае, але і абярэгавае значэнне, менавіта таму яго размяшчалі ўздоўж краёў адзення і разрэзаў тканіны, каб злыя сілы не маглі



Мал. 2. Касцюм замужняй жанчыны. 1920-я гг. в. Хабовічы Кобрынскага раёна Брэсцкай вобласці

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

трапіць да душы і цела чалавека. Жаночыя спадніцы мелі больш шырокую каляровую гаму: яны маглі быць аднаколернымі або мець паліхромны дэкор — у падоўжныя, папярочныя палоскі ці ў клетку.

Арнаментальная і каларыстычная своеасаблівасць кожнага касцюмнага комплексу вызначалася мясцовымі традыцыямі.

Для адзення цэнтральных раёнаў Брэстчыны ўласціва надзвычайная тонкасць і бялюткасць палатна, а таксама стрыманасць арнаментальнай аздобы, якая ў асноўным складалася з вузкіх чырвоных палосак. Яскравым прыкладам з'яўляюцца строі Іванаўскага, Івацэвіцкага, Бярозаўскага раёнаў.



Мал. 3. Спосаб завівання плата. в. Збураж Маларыцкага раёна Брэсцкай вобласці. Рэканструкцыя і малюнак М. Віннікавай

Адзенне жыхароў паўднёва-заходняй часткі Брэстчыны адрознівалася каларыстычнай насычанасцю, багаццем арнаментальнага аздаблення. Стылістычным адзінствам мастацка-дэкаратыўнага вырашэння, вытанчанасцю дробнай геаметрычнай арнаментыкі, уведзенай у кампазіцыю з вузкіх чырвоных палос, вызначаецца Кобрынскі строй. Доўгі і шырокі плат (прыкладна 350х55 см), прыгожа завіты на галаве, надаваў строю замужняй жанчыны асаблівую грацыёзнасць. У в. Руховічы, напрыклад, плат завівалі наступным чынам. Правы канец яго складвалі ў вузкую палоску — «кібалку». Ён утвараў невялікі абручык кругом галавы і доўгую пятлю спераду, праз якую праходзіў левы канец плата, што павольна драпіраваўся на шыі, а потым накідваўся ззаду на «хахалык» — драўляную



Мал. 4, 5. Касцюм замужняй жанчыны. Першая палова XX ст. Маларыцкі раён Брэсцкай вобласці

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ



Мал. 6. Касцюм замужняй жанчыны.
Пачатак XX ст. в. Лукі Калінкавіцкага раёна Гомельскай вобласці

прыладу, абшытую тканінай і падаткнутую зверху пад прычоску — валасы, скручаныя вузлом. Хахалык разам з прычоскай мацаваўся плеценым сеткаватым чапцом, да яго прышпільваўся накінуты левы канец плата (гл. мал. 1, 2).

Маларыцкаму строю ўласціва скульптурная маналітнасць сілуэта, графічная распрацаванасць арнаментальнага аздаблення і незвычайны каларыт, што ўтвараўся спалучэннем белага, цёмна-чырвонага і шэрага колераў. Маларыцкія платы ткаліся з больш тоўстых ільняных нітак, чым падобныя галаўныя ўборы на тэрыторыі суседняга Кобрынскага раёна. Адметным было іх аздабленне. Пры даўжыні платаў 300—320 см і шырыні 60—65 см, яны вышываліся шырокімі бардзюрамі шчыльнага ромба-геаметрычнага арнаменту, якія размяшчаўся на канцах, а на самых урачыстых платах — і на адным падоўжным баку. Разгледзім спосаб завівання плата, які існаваў у в. Збураж.

Плат у разгорнутым выглядзе накладаўся на галаву паверх валасоў, скручаных на макушцы і замацаваных ажурна сплеценым чапцом. Левы яго канец абрамляў твар, праходзіў пад падбародкам, падымаўся ўверх з правага боку і перакідваўся цераз сярэдзіну галавы зноў на левы бок. Пры гэтым яго папярочны край, аздоблены шырокім арнаментальным бардзюрам, закрываў левае плячо і вуглом спускаўся на спіну.

Правы канец плата складваўся ўдоўж папалам, а потым перагортваўся яшчэ два разы і атрымліваўся складзеным у шэсць столак. У такім выглядзе ён ахопліваў працягнуты пад падбародкам левы канец, падымаўся ўверх, накіроўваўся назад і абручыкам абыходзіў кругом галавы. Пры гэтым арнаментаваны беражок плата праходзіў па верху абручыка. Ззаду канец у такім жа складзеным выглядзе падтыкаўся знізу ўверх пад папярэдні слой, над якім утвараў невялікую пятлю, а астатняя яго частка звісала ўздоўж спіны паверх разгорнутага левага канца плата (гл. мал. 3, 4, 5).

Калінкавіцкі строй — узор традыцыйнага ўбрання жанчын Усходняга Палесся. Ён вызначаўся пышна арнаментаванай палатнянай сарочкай, якую насілі з доўгім шарсцяным андаракам і палатняным фартухом, багата ўпрыгожаным тканым арнаментам (гл. мал. 6).

Жаночае ўбранне Цэнтральнай Беларусі вылучаецца вытанчанасцю ромбагеаметрычнай арнаментыкі, што ўпрыгожвала белае ільняное адзенне. У пабудове

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

арнаменту, які ўкладаўся ў традыцыйныя шмат'ярусныя кампазіцыі, немалаважную ролю адыгрывалі фонавыя прабелы. Яны надавалі арнаментальным матывам лёгкаўспрымальны сілуэт і выразна выяўлялі іх графічны змест. Яркім прыкладам з'яўляецца жаночы касцюм Старадарожскага раёна. Для яго характэрна гармонія і ўраўнаважанасць усіх частак адзення, стрыманасць каларыту. Адметнасць касцюму надавала своеасаблiва павітая наметка, якая на поўначы раёна (вёскі Дражна, Падарэссе, Залужжа) называлася «намётам». Канцы яе багата аздабляліся ткацтвам або вышыўкай, мярэжкамі і абшываліся мохрыкамі. Характэрная рыса аздаблення намёта — арнамент на двух яго канцах быў розны і нашываўся на розных баках палатна.



Мал. 7. Спосаб завівання намёта. в. Дражна Старадарожскага раёна Мінскай вобласці. Рэканструкцыя і малюнак М. Віннікавай

Прычоска з валасоў, навітых на спецыяльны абручык — «тканку», пакрывалася плеценым чапцом, паверх якога завівалі намёт (прыкладныя памеры: 285х35 см). Намёт накладалі на галаву ў разгорнутым выглядзе такім чынам, каб правы яго канец быў разы ў тры карацейшы за левы. Ён праходзіў пад падбародкам, падымаўся ўверх з левага боку і перакідваўся цераз верх галавы зноў на правы бок. Яго арнаментаваны край прыкрываў скроню і спускаўся да пляча. Левы канец складваўся ўдоўж у чатыры столкі, праходзіў пад падбародкам і пад правым канцом, ззаду рабіў разварот у бок ілба, абручыкам абыходзіў кругом галавы, працягваўся знізу ўверх праз пятлю, утвораную ім пры развароце і спускаўся ўздоўж спіны (гл. мал. 7, 8).



Мал. 8. Касцюм замужняй жанчыны. Канец XIX — пачатак XX ст. Старадарожскі раён Мінскай вобласці

Матэрыял можа быць скарыстаны пры распрацоўцы стылізаваных сучасных, прадстаўнічых і сцэнічных варыянтаў традыцыйнага беларускага касцюма.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ